«Масленка» стала больш масавым і папулярным святам музея. Акрамя забаўляльнай праграмы, на свяце захоўваюцца і паказваюцца традыцыйныя элементы святкавання Масленкі на Беларусі: наведванне бабкі-павітухі, маладзіцы, ваджэнне масленічных карагодаў, спяванне масленічных песен падчас свята, а таксама частаванне блінамі, дзе кульмінацыяй свята з'яўляецца спальванне пудзіла Марэны. Таксама ў апошнія гады, акрамя Масленкі, папулярным стала ладзіць апошні дзень мсленічнага тыдня – «Даравальную нядзелю». Гэта свята больш сціплае за папярэдняе, але на ім таксама гучаць масленічныя песні, паказваюца звычаі святкавання гэтага дня. Штогод на «Гуканне вясны» у сакавіку збіраецца моладзь, калі ў музеі гучаць песні-«вяснянкі», якія праслаўляюць прыход вясновых дзён, водзяцца карагоды, наладжваюцца народныя традыцыйныя забавы. Мерапрыемства «Вербная нядзеля» запрашае наведальнікаў прыняць удзел у майстар-класе па ўпрыгожванні галінак вярбы. Свята «Юр'я» адзначаецца бліжэй да 6 траўня, з традыцыйнымі абыходамі двароў, са спевамі і ваджэннем карагодаў, паказам выгану жывёлы першы раз у поле з традыцыйнымі рытуаламі. Свята «Купалле», так улюблёнае наведвальнікамі, святкуецца два разы – па старому і новаму стылю: 23 (ці 24) чэрвеня і 6 (ці 7) ліпеня. Падчас мерапрыемства адбываюцца розныя майстар-класы, галоўным з якіх з'яўляецца пляценне вянкоў з кветак, распальваецца купальскае вогнішча, праз якое наведвальнікі з задавальннем скачуцьокаюць, моладзь пушчае вянкі па рацэ Пціч, падчас усяго мерапрыемства гучаць купальскія песні. На прыканцы лета святкуюць «Зажынкі» і «Дажынкі» – старажытныя земляробчыя святы, звязаныя з пачаткам і заканчэннем жніва, падчас правядзення якіх над музейнымі палямі разносяцца меладычныя песні жней. У снежні ладзіцца свята «Каляды» з паказам традыцыйнага абыходу двароў калядоўшчыкамі, а таксама традыцыйныя спевы, карагоды і танцы.

На тэрыторыю музея з'язджаюцца шматлікія госці, а таксама артысты, народныя майстры,– паслухаць фальклорныя калектывы, паглядзець новыя выстаўкі, набыць арыгінальныя сувеніры. Таксама ладзіцца танцавальная праграма для моладзі з удзелам фольк-груп, дзе кожны жадаючы мае магчымасць навучыцца народным танцам. З цягам часу сталі папулярны рэканструкцыі абрадаў розных рэгіёнаў, не раз музейная пляцоўка была месцам паказаў і рэалізацыі дыпломных праектаў студэнтаў кафедры этналогіі і фальклору, кафедры рэжысуры абрадаў і свят БДУКМ («Купалле», «Провады русалкі», «Свята каваля», «Каляды» і інш.). Выкарыстоўванне музеем такой формы працы, як свята, дае магчымасць у значнай ступені пашырыць межы ўзросту наведвальніка (ад дзяцей да дарослых). Гэта кажа аб тым, што музей – гэта прастора, якая валодае высокай моцай інфармацыйнага і эмацыйнага ўздзеяння. З цягам часу, за праведзеныя мерапрыемствы можна адзначыць, што арыентацыя свят менавіта на сямейнага наведвальніка (як мэтавая аўдыторыя).

Калі прааналізаваць уласны вопыт сучаснай рэканструкцыі свят на тэрыторыі БДМНАіП, то заўважна, што падчас мерапрыемства ўзнікае своеасаблівая камунікацыя паміж наведвальнкам з сучаснага часу і чалавекам мінулага праз створаныя ім матэрыяльныя каштоўнасці, праз побыт мінулых часоў, з уласцівымі ім поглядамі на свет, жахамі і спадзяваннямі на лепшае – гэта дае магчымасць успрыняць новыя веды, творча асэнсаваць інфармацыйную прастору музея, усвядоміць сувязь мінулага, сапраўднага і будучага, вызначыць сваё месца ў сацыяльна-часавай прасторы быцця, атрымаць веды аб гісторыка-культурным развіцці грамадства. Дзякуючы музею, адраджаецца традыцыя свята як культурна-гістарычнага феномену, як элемента жыцця асобы, які заўсёды меў выключнае значэнне ў «структурах паўсядзённасці і пераадолення яе» як асобнага чалавека (носьбіта культуры), так і грамадства цалкам.


**Спіс літаратуры:**

1. Жукова, О.Н. Взрослый посетитель – участник культурно-образовательных мероприятий в Белорусском государственном музее народной архитектуры и быта / О.Н. Жукова // Памяць продкаў праз музейны свет: праграма музейных чытанняў (Мінск, 7 снежня 2010 г.) / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск, 2011. – 120 с.
2. Локотко С.А. О культурно-образовательной концепции Белорусского государственного музея народной архитектуры и быта на современном этапе/ Локотко С.А. // Памяць продкаў праз музейны свет: праграма музейных чытанняў (Мінск, 7 снежня 2010 г.) / Нацыянальна бібліатэка Беларусі. – Мінск, 2011.- 120 с.
3. Пладунова Т. Мастацкая рэканструкцыя этнафоніі Купалля на святах і фестывалях / Т. Пладунова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, ўспрымання: зборнік навуковых прац удзельнікаў VIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 25-27 красавіка 2014 г.) / БДУКМ; рэдкал.: Языковіч В. Р. (адк. Рэд.) [і інш.] – Мінск: БДУКМ, 2014. – 216 с.



***Фёдар Рацык***


**ТРАДЫЦЫЯ «ПРЫКЛАДАННЯ КАМЕНЯ» Ў МОТАЛЬСКІМ МІКРАРЭГІЁНЕ ЯК ЭЛЕМЕНТ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ**


***Fedar Ratsyk***


**TRADITION "STONE APPLICATION" IN THE MOTOL MICROREGION AS AN ELEMENT OF HISTORICAL-CULTURAL HERITAGE**


*Разглядаецца бытаванне лакальнай традыцыйнай практыкі ўшанавання продкаў праз выкарыстанне надмагільных камянёў у кантэксце гістарычнага развіцця мястэчка Моталь на Заходнім Палессі.*

*We consider the existence of a local traditional practice of honoring ancestors through the use of tombstones in the context of the historical development of the town of Motol in the West Polesie.*


Актуальнае гістарычнае развіццё беларускага грамадства ставіць перад нашымі дзяржавай і соцыумам мэты, якія дазваляюць нам не толькі прагнуць, але і дасягаць вывучэння свайго мінулага, пераасэнсавання філасофскіх поглядаў на свет, а таксама захавання каранёвых рэлігійных практык продкаў. Менавіта традыцыі, звязаныя з ушанаваннем продкаў, даюць магчымасць адчуць тыя родавыя сувязі, якія паступова складваліся і мацаваліся многімі пакаленнямі.

Этнаграфічныя даследаванні Мотальскага мікрарэгіёна (вядомае ў пісьмовых крыніцах з XV ст. мястэчка Моталь сёння – аграгарадок Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці Беларусі) вядуцца на Заходнім Палессі даволі доўгі час. Аднак, менавіта асаблівасці рытуалаў звязаных з пахаваннем і захаваннем памяці аб нябожчыку, доўгі час не выклікалі цікаўнасці з боку айчынных даследчыкаў. Магчыма, гэта звязана з лакальным характарам распаўсюджання вывучаемай з'явы, разуменнем каштоўнасці традыцыі мясцовай супольнасцю, здольнасцю супольнасці самастойна яе аберагаць і ахоўваць, упэўненасцю носьбітаў ў пераймáнні практыкі падрастаючымі пакаленнямі, а таксама «неразгалошваннем» аб ёй зацікаўленым структурам дзеля захавання ў традыцыйных умовах.

Да нашага часу ў Мотalі захавалася адмысловая традыцыя «Прыкладанне камэня» падчас святкавання Міхайлаўскіх Дзядоў. Гэты звычай можна ўбачыць (мал. 1–2), калі прыехаць у Моталь у найбліжэйшую суботу наконадні праваслаўнага свята ўслаўлення Архангела Міхаіла (21 лістапада). У бягучым годзе Міхайлаўскія Дзяды будуць адзначаць 16 лістапада.

Тэрыторыя, на якой фіксуецца выкананне абраду, супадае з могілкамі вёсак Мотальскага прыхода. У пачатку XX стагоддзя ў склад Мотальскага прыхода ўваходзілі яшчэ вёскі Калілы, Крывіца, Пнюхі, Псышчава і Упірава, Тышкавічы. На працягу XX стагоддзя




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў склад Моталя былі ўключаныя вёскі Заазер'е, Дзедавічы, Панцавічы. На могілках гэтых вёсак традыцыя прыкладання каменя фіксуецца, але не з'яўляецца масавай і распаўсюджанай. Наяўнасць на магіле каменя тлумачыцца дэмаграфічнымі працэсамі і рэлігійнымі практыкамі ў дадзеным мікрарэгіёне, а менавіта: прывязкай жыхароў гэтых вёсак да прыхода. Менавіта актыўнасць прыхаджан і выкананне абрадавых дзеянняў у царкве дазваляе існаваць традыцыі. Некалькі гадоў таму сюды быў накіраваны святар, які шчыра прызнаўся, што не знаёмы з падобным рытуалам. Тады сабраліся старажылы вёскі і дэталёва пазнаёмілі новага святара са старой традыцыяй. Два бакі хутка знайшлі паразуменне, і абрад працягнуў сваё далейшае існаванне.


Малюнак 1 – Асвячэнне камянёў у царкве (2018)


Малюнак 2 – Від з боку алтарнай часткі (2018)


Малюнак 3 – Камень з надпісам АХМЗ (1647)


Малюнак 4 – Камень з лічбавым надпісам (1863)

Падрыхтоўка да святкавання ў розных сем'ях адрозніваецца ў залежнасці ад таго, памёр ці не нехта са сваякоў дадзенай сям'і ў перыяд ад мінулагодніх Дзядоў да цяперашніх. Загадзя патрэбна знайсці прыгожы палявы камень, і, з дапамогай спецыяльнага інструмента, высекчы на ім крыж і Галгофу (мал. 3–4). Даўней гэты працэс выконваўся ўручную зубілам і малатком, цяпер перавагу аддаюць больш сучасным прыладам.

Пачынаецца святкаванне Міхайлаўскіх Дзядоў у пятніцу ўвечары. У доме рыхтуюць посную вячэру. За сталом збіраецца ўся сям'я. Абавязковыя стравы на «дзедавай» вячэры – хлеб, куцця, капуста з грыбамі ці шчаўе з рыбай, каша з проса, кампот. У пачатку вячэры запальваюць свечку, якая павінна гарэць на працягу ўсёй трапезы. Вячэра пачынаецца з малітвы і запрашэння Дзядоў за стол. Для гэтага існуюць пэўныя выказванні: «Помолымса за усіх умэршых: за старэнькіх, за малэнькіх, за знаюшчых і нэзнаюшчых. Приходьтэ усі на вэчэру».

Пасля малітвы сям'я садзілася за стол, галава сям'і чэрпаў куццю першым, потым гаспадыня і ўсе астатнія. Пакуль гарэла свечка, сям'я хутка вячэрала і саступала месца Дзядам: «Свічка горыть, мы стомляемся, ім місте даем». Па завяршэнні вячэры свечку гасяць. Ежу на стале абавязкова пакідаюць на ноч. На наступны дзень (пасля службы ў царкве) стол накрываўся нанова. Ежу рыхтуюць свежую без прытрымлівання посту.

Раніцай усе ішлі на памінальную службу ў царкву. З сабой трэба абавязкова браць падрыхтаваны камень. У залежнасці ад яго памераў, у некаторых выпадках прыходзіцца нават выкарыстоўваць транспарт. У царкве камяні выкладваюць на падлогу, папярэдне пасцяліўшы сурвэтку, наступным чынам: з левага боку кладуць камяні, прыгатаваныя для нябожчыкаў–жанчын, а з правага – для нябожчыкаў–мужчын. Менавіта такая раскладка дазваляе палічыць усім прысутным, колькі чалавек якога полу памерла за гэты перыяд. Так, у 2015 годзе ў царкве асвячалася каля 60 камянёў.

Пасля паніхіды бацюшка пры запаленых свечках чытае малітву і асвячае камяні. Асвячоныя камяні потым нясуць на могілкі і прыкладваюць за крыжам, у галаве. Менавіта таму гэты абрад атрымаў назву «Прыкладанне каменя». Мясцовыя жыхары вераць, што душа на Дзяды і Наўскі Вялікдзень прылятае пасядзець і адпачыць на тым камені: «На Дзяды ці як службу (паніхіду) робять, то душа прылятае, і садзіцца на той камень». Увогуле сімволіка камянёў у традыцыйнай культуры беларусаў моцна звязана з тэмай продкаў і іх ушанавання [2].

Жыхары Моталя выдатна адчуваюць сябе адразу ў дзвюх гістарычных і рознatчасовых традыцыях: дахрысціянскай, язычніцкай (магільную прастору маркіравалі адным або двума камянямі), і больш позняй – хрысціянскай (магіла сваяка была пазначана крыжам). На працягу XX стагоддзя і яшчэ у першае дзесяцігоддзе XXI стараліся ставіць дубовы крыж. У сярэднім, дубовы крыж можа прастаяць 30–50 гадоў, у залежнасці ад якасці матэрыялу. Некаторыя асобнікі на сучасны момант налічваюць і па 80–100 гадоў. Але пасля таго, як крыж струхнее, яго выкідаюць на сметнік ці спальваюць. Адзіным напамінкам аб месцы пахавання застаецца камень. Калі месца ўжо поўнасцю становіцца роўным, то яго займаюць новым пахаваннем, а камень пераносяць у спецыяльнае месца. Сучасныя варыянты фабрычных крыжоў не задавальняюць патрэб нашчадкаў па ушанаванні памяці памерлых, задавальненні эстэтычных пераваг, і вырашаюцца ў карысць помнікаў з каменю.

З пункту гледжання дапаможных гістарычных дысцыплін, асаблівую цікавасць выклікаюць камяні з надпісамі на старaславянскай мове. Камянёў з надпісамі сустракаецца некаторая колькасць. Канцэнтрацыя іх найбольшая на саміх могілках, якія зараз выкарыстоўваюцца, у месцах знаходжання колішніх могілак, а менавіта на царкоўным пляцы, урочышчы Астравок, дзе калісці, паводле успамінаў старажылаў, знаходзіліся могілкі з капліцай, якая была разбурана польскімі ўладамі ў 1936 годзе. Кожны камень патрабуе больш дэтальнага вывучэння. Але фіксацыя знаходжання такіх камянёў з надпісамі ў літаратуры ёсць: «На усадьбе священника, по Ивановской улице, а также на базарной площади м. Мотоля находимы были человеческие кости; вместе с костями на площади была найдена раз высокая цилиндрическая шапка с верхушкой из меди. На паперти православной Мотольской церкви лежит камень с славянскими цифрами – ҂ахна ; найден он в земле, на базарной площади в м. Мотоле» [1]. Калі суаднесці дадзеныя літары з правіламі запісу лічбаў кірыліцай, атрымаем 1651 год. Такім чынам, традыцыя дакладна існавала ў Моталі ўжо ў XVII стагоддзі.

Традыцыя «Прыкладання камэня» з'яўляецца тым духоўным стрыжнем, які аб'ядноўвае мясцовую супольнасць, дазваляе маталянам захоўваць у жывым бытаванні практыку, якая непарыўна, без перапынення традыцыі, прыйшла са старажытнасці Заходняга Палесся, чаму ёсць пераканаўчыя матэрыяльныя пацвярджэнні. Непарушнасць дадзенай мотальскай традыцыі звязана з яе інтэграваннем у моцныя мясцовыя родавыя сувязі тубыльцаў, з перадачай ведаў, вопыту і вуснай памяці ад продкаў да нашчадкаў у супольнасці жыхароў Моталя. Традыцыя «Прыкладання камэня» – сапраўдная гісторыка-культурная каштоўнасць Заходняга Палесся.

**Спіс літаратуры:**


1. Ф. В.Покровский.Археологическая карта Гроденской губернии. Вильна 1895
2. Камень як сімвал родавай памяці беларусаў[Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу :http://zviazda.by/be/news/20170217/1487346163-kamen-yak-simval-rodavay-pamyaci-belarusau– Дата доступу : 01.04.2019г.
3. До нашего времени в Мотоле сохранилась уникальная традиция «Прыкладанне камэня» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу :https://vk.com/wall418430001_190 - Дата доступу : 01.04.2019 г




РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ